До пяти считаем, (приседают пять раз) Дружно приседаем. Ура! (кричат, подняв руки вверх)

Данную физкультминутку предлагаем использовать на уроке по теме «Пасха»:

Солнышко, солнышко, золотое донышко!
Гори, гори ясно, чтобы не погасло!
(руки вверх.)
Побежал в саду ручей,
Прилетели сто грачей,
(Машут руками.)
А сугробы тают, тают,
(Приседают.)
А цветочки подрастают.
(Поднимают руки вверх.

Таким образом, практически на каждом уроке учитель может проводить тематические физкультминутки. Однако, детям быстро надоедают одни и те же упражнения, повторяющиеся из урока в урок. А на таком учебном предмете как ОРКСЭ не все физкультминутки подходят по тематике. Поэтому необходимо творчески подходить к выбору физкультминутки, подбирать их внимательно, можно придумывать их самостоятельно.

**Литература**

1. Дыхан, Л.Б. Педагогические условия валеологизации образовательной среды младших школьников [Текст]: автореф. … дис. канд. пед. наук / Л. Б. Дыхан. – Ростов н/Д, 2001. – 23 с.
2. Смирнов, Н. К. Здоровьесберегающие образовательные технологии в работе учителя и школы. [Текст] / Н. К. Смирнов. – М.: Аркти, 2003. – 272 с.
3.Технологии развивающего образования / Г. К. Селевко. – М.: НИИ шк. технологий, 2005 (ОАО Можайский полигр. комб.). – 185 с.: ил., табл.
4. Кураев А.В. Основы религиозных культур и светской этики Учебник – М.: Просвещение. 2013. – 95 с.
5. Андржеевская, И.Ю. Физминутки: 50 упражнений для начальной школы. – М.: ВИТА – ПРЕСС, 2012. – 30 с.

## КРЭАТЫЎНАЯ ЛІНГВІСТЫКА НА ЎРОКАХ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Быўшава В.Д.***
*навучэнка 4 курса Горацкага педкаледжа УА “МДУ імя А.А. Куляшова”,*
*аг. Леніна, Горацкі раён, Магілёўская вобласць, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Супрун В.М., выкладчык

Развіццё творчага патэнцыялу асобы – гэта надзвычай актуальнае пытанне ў адукацыйным працэсе. Не выпадкова ж расійскі псіхолаг Я. П. Ільін называе творчых асоб рухавіком чалавецтва [1, с. 6].

Сучасныя даследчыкі дзіцячай псіхалогіі і псіхалогіі творчасці ўпэўнены, што творчасці можна навучыць. Псіхолагі сцвярджаюць думку пра рэпрадуктыўны і творчы ўзроўні здольнасцяў чалавека, выбудоўваючы ўзроўні ад адоранасці да геніяльнасці. Ад адоранасці залежыць не якасць ці паспяховасць выкананага задання, а толькі магчымасць паспяховага выканання прапанаванага задання тым, хто ўжо авалодаў неабходнымі ведамі і навыкамі.

Сучаснае разуменне крэатыўнасці, творчасці характарызуецца шырокім дыяпазонам пунктаў гледжання на гэтае пытанне, але ўсе пагаджаюцца з думкай: для фарміравання творчай актыўнасці недастаткова проста сумы сфарміраваных у чалавека пэўных ведаў, уменняў і навыкаў, бо пры рэальнай творчасці неабходны выхад за межы ўжо існуючых ведаў. Можна стаць інтэлектуалам, але пры гэтым не быць творцам.

Репозиторий ВГУ

У развіцці здольнасцяў малодшых школьнікаў важна не спыняць вучэбную дзейнасць. Школьная адукацыя павінна ствараць умовы для фарміравання суб'ектыўнага свету асобы кожнага школьніка з улікам яго ўнікальнасці. Таму крытэрыямі ацэнкі эфектыўнасці форм і метадаў школьнага навучання павінны быць не толькі ўзровень ведаў, уменняў і інтэлектуальных якасцяў, але і паказчыкі сфарміраванасці творчага мыслення кожнага вучня.

Інтэлектуальная творчасць у дзіцячым узросце – гэта працэс стварэння суб'ектыўна новага, заснаваны на здольнасці парадзіць прадуктыўныя арыгінальныя ідэі і выходзіць за межы стандартных патрабаванняў дзейнасці [2]. Крэатыўная дзейнасць павінна быць мэтанакіраванай. Гэта дапаможа вучню асэнсаваць свае здольнасці і магчымасці па творчым рашэнні розных вучэбных задач, суадносіць свае магчымасці з патрабаваннямі настаўніка, ацаніць сябе ў класным калектыве. Веданне ўласных слабых і моцных бакоў неабходна для самаўдасканальвання. Крэатыўная асоба павінна быць адпаведна творчай дзейнасці і дзейнасным вынікам.

Урок творчасці павінен зрабіць вучэбны працэс развіццёвым.

Крэатыўны здвоены ўрок утрымлівае некалькі кампазіцыйных блокаў: матывацыя, змястоўная частка, псіхалагічная разгрузка ці фізкультхвілінка, галаваломка, перапынак, інтэлектуальная размінка, змястоўная частка, інтэлектуальная падтрымка-гульня, вынік урока [3].

Разгледзім падрабязней урок беларускай мовы па тэме "Марфеміка. Паўтарэнне", які быў праведзены мной на пераддыпломнай практыцы ў 4 класе СШ № 15 г. Магілёва. Паводле сваёй формы гэты ўрок класна-ўрочны, паводле мэтавай дамінанты – урок паўтарэння, паводле пераважнага метаду – скіраваны на развіццё творчага мыслення.

Асноўных этапаў было некалькі:

1. Матывацыя (тут трэба было захапіць вучняў незвычайнай творчай прапановай папрацаваць на ўроку ландшафтнымі дызайнерамі).

2. Змястоўная частка (вучням прапануецца магчымасць папрацаваць дызайнерамі на ўроку беларускай мовы, паўтараюцца веды пра марфемы, фарміруюцца тэма (Што вядома пра марфемы беларускай мовы?) і праблема (Стварыць Марфемны парк беларускай мовы), распрацоўваюцца і абмяркоўваюцца разнастайныя прапановы, прымаецца рашэнне выкарыстаць для малюнкаў агульнапрынятыя сімвалы марфем, распрацоўка ў парах магчымых варыянтаў лінгвістычных малюнкаў).

Вучняў пачатковых класаў вызначае павышаная пазнавальная і творчая актыўнасць, і гэта стымулюе іх да выхаду за межы школьнай праграмы ў развіцці сваіх ведаў і уменняў. Творчая самастойная работа забяспечвае магчымасць самарэалізацыі асобы дзіцяці ў вучэбным працэсе.

Пасля работы ў парах дзеці прадстаўляюць свой варыянт лінгвістычных малюнкаў: домікі з сімвалаў канчатка і суфікса, елачкі з графічных сімвалаў суфікса, дрэвы з галінкамі – сімваламі каранёў і прыставак. Пры азнаямленні з варыянтамі малюнкаў пераадольваецца псіхалагічная інэрцыя, усе вучні актыўна ўключаюцца ў творчую вучэбную дзейнасць.

Пасля фізкультхвілінкі праводзіўся асноўны і самы складаны этап вучэбнай работы. Вучні напаўнялі свае канструкцыі зместам – канкрэтнымі марфемамі, якія мелі нейкую агульную прыкмету. Праз гульню "Хто хутчэй?" былі запісаны на дошцы ўсе вядомыя дзецям марфемы, затым адбылася сістэматызацыя запісанага праз вызначэнне марфем аднолькавага граматычнага значэння. З дапамогай настаўніка на дошцы запісваюцца падсістэмы марфем: - *нязменныя прыстаўкі;* - *прыстаўкі на з-/с-;* - *канчаткі дзеясловаў цяперашняга часу;* - *канчаткі назоўнікаў адзіночнага ліку;* -*канчаткі прыметнікаў адзіночнага ліку;* - *суфіксы дзеясловаў у форме інфінітыва;* - *суфіксы прыметнікаў;* - *суфіксы з памяншальна-ласкальным значэннем;* - і інш.

Вучні выбіралі адну марфему, звязаўшы яе з якой-небудзь адной часцінай мовы ці вылучыўшы яе ў розных часцінах мовы. Гэтыя падсістэмы становяцца асновай для стварэння мадэлі, а вынікам мадэлі будзе лінгвістычны малюнак для марфемнага парку.

Рэпазіторый ВДУ

Кожны малюнак павінен мець уласную назву, адпаведную свайму зместу. Так на ўроку беларускай мовы ўзнікаюць ландшафтныя лінгвістычныя фігуркі: Кветачка дзеяслоўных канчаткаў, Клумбы памяншальна-ласкальных суфіксаў назоўнікаў, Елачкі прыставак, Піраміды канчаткаў розных часцін мовы, Дрэва канчаткаў назоўнікаў адзіночнага ліку, Прыступкі прыставак. Варыянтаў шмат, і малюнкі марфемных паркаў атрымліваюцца самымі разнастайнымі: слайды 1, 2 і 3.

У якасці дадатковага творчага задання можна прапанаваць вучням зашыфраваць у пэўны лінгвістычны малюнак слова ці некалькі слоў з агульнымі марфемнымі прыкметамі. Напрыклад, на слайдзе 4 паказана Піраміда марфемнай будовы назоўнікаў – назваў маладых істот.

Як выглядае Парк марфем у канчатковым выглядзе? Як ужо адзначалася, варыянтаў шмат, адзін з іх адлюстраваны на слайдзе 5.

Апошні блок у структуры такога ўрока – гэта кароткі вынік і рэфлексія. Варыянтаў правядзення рэфлексіі шмат, і кожны настаўнік мае права на выбар найбольш зручнага варыянта.

Дамашняе заданне: падрыхтаваць віртуальную экскурсію.

Чым выніковы такі ўрок? У працэсе выканання заданняў па стварэнні Парку марфем вучні прайшлі асноўныя этапы творчасці: абдумвалі ідэю, стваралі і ўдасканальвалі свае мадэлі. У працэсе абмеркавання варыянтаў для аптымальнага рашэння пастаўленых задач фарміраваліся ўменні разумець сэнс выказванняў іншых дзяцей і здольнасць дакладна выразіць свае думкі; акрамя гэтага, удасканальваліся уменні супрацоўнічаць і і прадуктыўна ўзаемадзейнічаць на камунікатыўным узроўні. Іншымі словамі, фарміравалася камунікатыўная кампетэнцыя школьнікаў.

Калі настаўнік імкнецца выхаваць са свайго вучня творчую асобу, то трэба пастаянна ствараць умовы для развіцця творчых здольнасцяў. І трэба не забывацца, што галоўная задача кожнага настаўніка – зрабіць інтэлектуальную і творчую працу школьнікаў камфортнай, каб яна цалкам адпавядала схільнасцям і магчымасцям кожнага дзіцяці, але пры гэтым не ператварылася з навучальнага працэсу ў забаўляльны.

**Літаратура**

1. Ильин, Е.П. Психология творчества, креативности, одаренности / Е.П. Ильин. – СПб. : Питер, 2012. – 448 с.
2. Холодная, М.А. Психология интеллекта: парадоксы и исследования / М.А. Холодная. – СПб.: ООО Изд-во «Питер», 2002. – 272 с.
3. Утёмов, В.В. Педагогика креативности: Прикладной курс научного творчества: учебное пособие / В.В. Утёмов, М.М. Зиновкина, П.М. Горев. – Киров: АНОО «Межрегиональный ЦИТО», 2013. – 212 с.

## МЕТОДЫ И СРЕДСТВА ПОВЫШЕНИЯ МОТИВАЦИИ К УЧЕНИЮ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ

***Вздорова А.А.***
*студентка 2 курса ГБПОУ «Дзержинский педагогический колледж», г. Дзержинск, Нижегородская область, Российская Федерация*
Научный руководитель – Якимова Н.И., преподаватель

В современной школе вопрос о мотивации учения без преувеличения может быть назван центральным, так как стремление к знаниям является источником деятельности и выполняет функцию побуждения и поиске сути образования в учебной деятельности. Младший школьный возраст благоприятно располагает основу для приобретения новейших знаний и желания учиться, т.к. результаты деятельности человека зависят не только от интеллекта, но и в большинстве случаев от мотивов.

Репозиторий ВГУ